*Дадатак 2*

**Заданні, накіраваныя на прымяненне ведаў у вопыце дзейнасці**

**Тэма: “Чалавек і здароўе”**
***Стымул.*** Наш клас на летніх канікулах збіраецца ў турыстычны паход. У гэты час у лесе шмат кляшчоў. Як добра адпачыць і не пацярпець ад укусу насякомага?
***Задачная фармуліроўка.*** Даведацца, як абараніць сябе ад укусу кляшчоў.
***Крыніца інфармацыі.*** Памятка для вучняў “Як зберагчыся ад кляшча?”
З прыходам веснавога цяпла людзі пачынаюць выязджаць на прыроду.

**Памятка “Як зберагчыся ў лесе?”**

У першую чаргу трэба звярнуць увагу на адзенне. Яно павінна быць светлых адценняў. Кляшчы прысмоктваюцца не адразу. Яны доўга поўзаюць і шукаюць для сябе найлепшае месца: гэта вобласць шыі, падпахавыя ўпадзіны і так далей. Кляшчоў лёгка заўважыць на светлай тканіне або на целе пры аглядзе.
Трэба абавязкова надзець шкарпэткі, а штаны заправіць у боты або бацінкі. Рукавы адзення павінны шчыльна прылягаць да рукі. Пад адзенне, якое шчыльна прылягае да цела, клешч можа запаўзці, але не зможа прысмактацца: для таго, каб укусіць, яму неабходна прыняць вертыкальнае становішча. Не забудзьцеся надзець галаўны ўбор, а адкрытыя часткі цела абпырскаць рэпелентам.
Рэпеленты бываюць двух відаў: адны наносяцца на скуру, а другія толькі на адзенне. Напалохаць кляшчоў могуць некаторыя рэчывы з рэзкім пахам: камфара, гваздзік, карыца, бальзам “Залатая зорка”, трайны адэкалон. Поўнай абароны яны не даюць, але ўсё ж такі дапамагаюць на некаторы час.
Бываючы на прыродзе, пастарайцеся выбраць найбольш бяспечнае месца для адпачынку. Лепш трымацца далей ад дрэў, кустоў, высокай травы. Месца, пажадана, каб было адкрытым і праветрываемым. Кляшчы могуць трапіць да вас у дом з букетам кветак, абуткам і іншымі прадметамі.
Калі ўсё ж вас укусіў клешч, нельга давіць на яго, таму што на пальцах могуць быць расколіны, ранкі, праз каторыя вірус клешчавога энцэфаліту можа трапіць у кроў. Неабходна адразу звярнуцца ў бальніцу. Чым хутчэй вам выдаляць кляшча, тым меншая доза ўзбуджальніка захворвання трапіць у арганізм.

**Жадаем вам здароўя і прыемнага адпачынку на свежым паветры!**

| | |
|---|---|
| Бланк для выканання задання | Прачытай уважліва памятку. Адкажы на пытанні.<br>1. Якое адзенне трэба выбраць для прагулкі па лесе? Патрэбнае адзнач знакам «+»<br><br>2. З прапанаваных малюнкаў выберыце сродак абароны (рэпелент) ад кляшчоў. Патрэбнае адзнач знакам «+».<br><br><br>3. Якія рэчы сваім пахам могуць напалохаць кляшчоў? Патрэбнае адзнач знакам «+».<br><br>4. Што неабходна зрабіць, калі клешч усё ж такі ўкусіў? Патрэбнае адзначце знакам «+».<br> |